Аддзел адукацыі Маладзечанскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Хажоўская сярэдняя школа”

# Таямніцы старога падмурка

*Кіраўнік*:
Савіцкая Жанна Адамаўна
настаўнік гісторыі

ааг. Хажова, 2013

**Змест**

**Уводзіны**…………………………………………………………………...3-4
**Глава I**………………………………………..……………………………...4-7
1.1. Гісторыя будаўніцтва касцёла…………………….……………….......4
1.2. Як выглядаў храм…………………………….………………………..5
1.3. Лёс будынка…………………………………….……………………...5
**Глава II**………………………………………………….………………......7
Матэрыялы і метады даследавання………..……………….……………..7
**Глава III**……………………………….…………….…………………….8
Вынікі даследаванняў……………………………….……………………..8
**Заключэнне**………………………………………………………………10
**Выкарыстаныя крыніцы**………………………………………………11
**Дадатак:** ..............................................................................................12

## Уводзіны

Мяне заўсёды цікавіла мінулае роднай вёскі. Асаблівы інтарэс выклікаюць у мяне старыя руіны будынкаў, якія ўражваюць сваёй загадкавай і таямнічай прыгажосцю.

Пагэтаму мяне зацікавіў падмурак на ўзвышшы каля дарогі пры ўездзе ў вёску. Пасярод стаіць высокі драўляны крыж. Непадалёку ад яго бачны каменныя пліты, напалову ўросшыя ў зямлю. Магчыма, гэта захараненні, бо на заімшэлых камянях праглядваюцца нейкія надпісы. А падмурак, магчыма, належаў храму, бо з гісторыі вёскі Хажова я даведаўся, што ў далёкім мінулым тут дзейнічала 5 храмаў: каталіцкі, праваслаўны, уніяцкі, мусульманскі і яўрэйская сінагога.

Асновай для спробы навукова асэнсаваць гісторыю разбуранага храма ў нашай вёсцы стала Палажэнне аб акцыі “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся” у рамках трэцяга этапа “Таямніцы малой радзімы”, прынятае ў 2012 годзе. Галоўная задача Палажэння – “усебакова вывучыць сваю малую радзіму, адраджаць рэгіянальныя культурныя традыцыі і звычаі, захоўваць гісторыка – культурную і прыродную спадчыну сваёй малой радзімы”. Гэта супала з нашым разуменнем вывучэння свайго роднага краю. [13, с.2]

Я вырашыў падрабязней вывучыць *пытанні*:

- Што гэта за будынак тут стаяў?
- Якая яго гісторыя?
- Хто і калі яго пабудаваў?
- Чаму ён быў разбураны?

**Актуальнасць**. Мы шануем памяць продкаў. Не павінна губляцца сувязь з мінулым нашай малой Радзімы. Для гэтага мы даследуем і аднаўляем у памяці страчаныя гісторыка – краязнаўчыя помнікі сваёй мясцовасці.

**Мэта** работы: Выявіць ролю былога будынка ў жыцці вяскоўцаў, высветліць прычыны яго разбурэння.

**Задачы**:

- выявіць і даследаваць былы будынак;
- вызначыць значнасць будынка для жыцця людзей;
- правесці апытванне і анкеціраванне з мэтай выяўлення значэння будынка;
- сабраць шматлікія інфармацыйныя звесткі;
- апісаць гісторыю даследуемага аспекта;
- абагульніць і звязаць у адзінае цэлае сабраны матэрыял, што дазволіла б прасачыць цікавую гісторыю роднага краю;

- адшукаць дадатковыя гістарычныя дадзеныя з гісторыі сваёй вёскі і выкарыстоўваць як дадатковы матэрыял пры вывучэнні звестак школьнага падручніка.

**Аб'ект** ***даследавання***: стары падмурак.

**Прадмет** ***даследавання***: краязнаўства.

**Гіпотэза**: Прадвызначым, што магчыма на месцы старога падмурка стаяў у мінулым каталіцкі храм.

**Метады** ***даследавання***:

- збор і аналіз інфармацыі па дадзенай тэме;
- праца з архівамі;
- праца з дакументамі музея;
- сацыяльны апрос;
- гутарка з мясцовымі жыхарамі;
- інтэрв'ю;
- назіранне;
- апісанне.

***Практычная значнасць даследавання***: мала хто не пагадзіцца з тым, што вучань, які дакранаецца да заімшэлых камянёў старога падмурка і даследуе гісторыю храма, які на ім стаяў, будзе зусім па іншаму ставіцца да гісторыі сваёй Радзімы і да гістарычных ведаў.

## Глава I

### 1.1. Гісторыя будаўніцтва касцёла

Правёўшы розныя даследаванні і вывучыўшы адпаведную літаратуру, я даведаўся, што на месцы старога падмурка быў будынак, які з'яўляўся касцёлам.

Касцёл (castellum), невялікая крэпасць, польская і беларуская назва рымска – каталіцкага храма. Паводле царкоўнай дагматыкі касцёл з'яўляецца домам Бога і месцам малітвы. [12, ст.160]

Калі ехаць з вёскі Мойсічы ў вёску Хажова, то, уязджаючы ў яе, з левага боку, каля дарогі, на высокім жывапісным узгорку, можна ўбачыць падмуркі будынка. Даследчык адразу адзначыць, што месца пад пабудову было выбрана вельмі здатнае і прывабнае. Узгорак сярод адносна роўнай і плоскай мясцовасці, дзе быў пабудаваны касцёл, пануе над наваколіцай. (Дадатак 1)

Я даведаўся, што касцёл быў заснаваны ў 1489 г дзедзіцам Хажова Алёхнам Судзімонтавічам, канцлерам літоўскім. Храму быў дадзены тытул

Святога Антонія Падуанскага. Але будынак касцёла некалькі разоў перабудоўваўся, так як із-за эпідэмій і войнаў прыходзіў у заняпад.

У 1540 годзе віленскі епіскап Павел Гальшанскі пабудаваў тут новы касцёл. У 1622 г новы будынак быў узведзены ксяндзом Валянцінам Завадскім, а у 1733 годзе – ксяндзом Стэфанам Вайкоўскім. У 1746 г касцёл Святога Антонія быў значна рэканструяваны і павялічаны ў памерах. У 1869г святыня была перабудавана ў праваслаўную царкву. У 1918 г касцёл быў вернуты католікам. [14, с.4]

**1.2. Як выглядаў храм**

Што ж уяўляў сабою будынак касцёла? Дакладных фотаздымкаў (Дадатак 1), на жаль, не захавалася, але са слоў старажылаў сяла і адпаведнай літаратуры я даведаўся, што храм быў драўляны, на каменным падмурку, збудаванне з трохграннай апсідай, завершанае пасярэдзіне капулай большай, а па канцах дзвюма капулкамі маленькімі.

Закрыстыя была зроблена за галоўным алтаром за асобным уваходам. Было шэсць вокнаў з бакоў фасаду касцёла і два акны ў закрыстыі.

Будынак святыні меў 20 аршынаў у даўжыню і 12 у шырыню. Касцёл упрыгожвалі чатыры двух’ярусныя алтары і вялікі “на оптыцы маляваны” з абразом Маці Божай Чанстахоўскай і алтары Святога Антонія Падуанскага, Святога Ізыдора, Святога Тадэвуша.

Асобна стаяла драўляная, на тры ярусы, пакрытая гонтай, з купалком наверсе, званіца, узведзеная на сродкі Тадэвуша Агінскага, ваяводы Трокскага, пры людской дапамозе.

Пры касцёле дзейнічалі альтарыя, брацтва Святога Ізыдора, шпіталь і школа пад апекай манахаў – трынітарыяў з Маладзечна. [14, с.4]

З успамінаў старажылаў сяла мы даведаліся, што, дзесьці стагоддзе назад, гару, пры ўездзе ў Хажова, дзе сёння стаіць драўляны крыж, называлі ў народзе “Ксяндзовай”. А ў 1911 годзе здарылася пабываць у Хажове ў ксяндзовай хаце Якубу Коласу. Ён наведаў настаўніцу – рэвалюцыянерку Лізавету Андрэеўну Карніловіч, якая была дачкой мясцовага настаяцеля царквы, бо ў той час касцёл быў ператвораны ў праваслаўны храм. Аб гэтым нават пісаў Г.А. Кахановскі ў сваёй кнізе “Повязь часоў”. [7, с.68]

**1.3. Лёс будынка**

У пачатку 1947 г мясцовыя ўлады адабралі тры будынкі, якія належалі касцёлу: у плябаніі размясцілі пошту, пасялілі настаўнікаў школы і іншых

жыхароў, адзін будынак спалілі на дровы. У гэтым жа годзе ксёндз Пётр Пятровіч Пупін, чалавек высокай эрудыцыі (валодаў нямецкай, французскай, польскай, літоўскай мовамі), які карыстаўся вялікай павагай у насельніцтва, быў арыштаваны і асуджаны, а касцёл закрылі. У 1949 г у ім зрабілі калгасны склад.

У 1955 г ксяндза П.П. Пупіна адпусцілі, але зарэгістравалі пробашчам Рубяжэвіцкай парафіі, а Хажоўскі касцёл у 1956 г увогуле разабралі. Захаваліся толькі падмуркі касцёла (па якіх зроблена рэканструкцыя плана). На гэтым месцы сёння ўстаноўлены і асвечаны высокі драўляны крыж. [14, с.4]

Вось такім, магчыма, і быў наш касцёл. У памяць аб ім засталіся аповеды, легенды людской памяці і руіны, што жывым дакорам стаяць каля дарогі.

Карацей кажучы, тыповая постсавецкая прастора. Звернемся да навуковага тлумачэння гэтай з'явы ў гісторыі каталіцкай канфесіі.

У 1920-30-х гадах у краіне шырокі размах набыла антырэлігійная прапаганда. Пачаліся масавыя арышты духавенства, якія суправаджаліся закрыццём храмаў. У заходніх абласцях Беларусі, пасля далучэння іх да БССР (1939г), адбывалася саветызацыя. Але не заўсёды ўлічваліся мясцовыя асаблівасці культурна – нацыянальнага і рэлігійнага жыцця, знішчаліся помнікі, ажыццяўляліся ганенні супраць веруючых. [2, с.32]

Такія ж падзеі адбываліся і ў нашай вёсцы.

Пасля Другой сусветнай вайны ўзмацніліся меры па абмежаванні дзейнасці каталіцкага духавенства. Свяшчэннікам было забаронена ездзіць па населеных пунктах і праводзіць выхаваўчую работу сярод прыхажан. [8, с.73]

За 1959-1966 гг колькасць абшчын рымска-каталіцкай царквы паменшылася, былі зняты з рэгістрацыі 80 касцёлаў. [10, с.464]

З нашага даследавання вынікае, што ў 1947 годзе быў закрыты Хажоўскі касцёл, а ў 1956 годзе яго ўвогуле разабралі. [14, с.4]

Паваротным пунктам у становішчы рэлігіі і веруючых с СССР сталі 1986-1987 гг. Царква атрымала права свабоднай дзейнасці. У 1990-я гады нармалізацыя адносін дзяржавы да рэлігійных аб'яднанняў садзейнічала адраджэнню каталіцкай царквы. [8, с.125]

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь забяспечвае роўнасць перад законам усіх рэлігій і веравызнанняў (Артыкул 31). [6, с.10]

У 1992 годзе закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях" аб'явіў свабоду рэлігійных аб'яднанняў. Закон асабліва адзначае ролю традыцыйна існуючых у Беларусі рэлігій, у тым ліку каталіцкай, якія ўнеслі значны ўклад у гістарычнае развіццё і станаўленне

духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Рымска – каталіцкая царква ў Беларусі з’яўляецца другой (пасля праваслаўнай) па колькасці веруючых і абшчын. [10, с.466]

Згодна з даннымі за 2008-2012 гг у Беларусі налічваецца звыш 450 каталіцкіх храмаў, яшчэ 35 знаходзяцца на стадыі будаўніцтва. [16]

Сёння адной з важных задач палітыкі дзяржавы з’яўляецца захаванне помнікаў айчыннай гісторыі і культуры. Вярхоўным Саветам Беларусі прыняты шэраг законаў, якія рэгулююць нарматыўна – прававыя адносіны ў сферы аховы гісторыка – культурнай спадчыны (“Аб ахове гісторыка – культурнай спадчыны”, 1992г). [1, с.17]

Згодна з артыкулам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (Арт.54) мы павінны берагчы гісторыка – культурную, духоўную спадчыну нацыі і ў цэлым набытак краіны. [6, с.60]

Рэспубліка Беларусь кіруецца ў сваёй дзейнасці ў вобласці аховы культурнай спадчыны канвенцыямі і рэкамендацыямі ЮНЕСКА па ахове культурнай спадчыны.

У апошнія гады ў рэспубліцы праводзіцца мэтанакіраваная работа не толькі па выртанні гісторыка-культурнай спадчыны, але і па рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гэта мы бачым на прыкладах Мірскага і Нясвіжскага замкава – паркавых комплексаў, Барысаваглебскай царквы ў Гродне, Благавешчанскай царквы ў Віцебску. [15, с.237]

Такім чынам, я мяркую, што мара нашых вясковых вернікаў – католікаў, якія складаюць 20% ад вернікаў сельскага Савета [Дадатак 5], аб аднаўленні касцёла ўвогуле магчыма.

## Глава II
## Матэрыялы і метады даследавання

***2.1***. Апыталі мясцовых жыхароў вёскі (Анкета – Дадатак №2), выявілі назначэнне будынка, узялі інтэрв’ю ў старажылаў сяла: Сысун Я.І.; Грышэль С.І., Кузіна Е.Я.

***2.2***. Вывучылі шматлікія спецыяльныя даведнікі і энцыклапедыі.

***2.3***. Вывучылі дакументы школьнага музея (Дадатак 3), сельскага савета (дадатак 5).

***2.4***. Наведалі дзяржаўны занальны архіў горада Маладзечна, даведаліся аб існаванні даступнай інфармацыі аб касцёле.

***2.5***. Выявілі неабходную інфармацыю аб касцёле ў старых мясцовых сродках масавай інфармацыі (дадатак 4).

***2.6***. Правялі аналіз шматлікіх інфармацыйных звестак аб каталіцкім храме з мэтай выяўлення значэння касцёла для жыцця людзей вёскі.

***2.7***. Складанне прапаноў для папулярызацыі краязнаўства сярод навучэнцаў.

## Глава III
## Вынікі даследаванняў

***3.1***. На аснове апытання пажылых мясцовых жыхароў вёскі мы ўстанавілі, што на месцы старога падмурка стаяў касцёл. (Анкета, Дадатак №2). З успамінаў 90-гадовай жыхаркі в. Хажова Я.І. Сысун мы даведаліся, што каталіцкі храм быў заснаваны ў канцы 15 стагоддзя, шмат разоў перабудоўваўся, быў закрыты і разбураны ў сярэдзіне 20 стагоддзя (Дадатак №3). Прааналізаваўшы адказы аднавяскоўцаў, мы зрабілі наступны вывад: Большасць вяскоўцаў ведаюць аб існаванні касцёла.

*Вывад*: на месцы падмурка дзейнічаў 5 стагоддзяў каталіцкі храм. Старажылы сяла, якія хадзілі на службу ў касцёл, успамінаюць яго з удзячнасцю. Вера і малітвы дапамагалі ім выжыць у цяжкія часы жыцця. Каталіцкія вернікі вельмі шкадуюць, што храм быў знішчаны. Нельга разбураць святыя, намоленыя людзьмі Божыя храмы. Разбураючы касцёлы і цэрквы, замкі і сядзібы людзі страчваюць сваю гісторыю, ператвараючы нас у людзей, якія не ведаюць і не шануюць сваё мінулае. Руіны касцёла – помнік нашаму бяспамяцтву. А колькі такіх помнікаў на Беларусі!

***3.2***. Нічога не знайшлі аб касцёле ў шматлікіх спецыяльных даведніках і энцыклапедыях. Нават выданне “Энцыклапедычны даведнік Каталіцкія Храмы Беларусі” пад аўтарствам А.М. Кулагіна абыходзіць касцёл маўчаннем. У гісторыка – дакументальнай хроніцы Маладзечанскага раёна (кнізе “Памяць”) толькі ўпамінаецца, што на тэрыторыі в. Хажова калісьці дзейнічаў каталіцкі храм.

*Вывад*: Каб атрымаць больш дасканалую інфармацыю аб касцёле неабходна звярнуцца ў Дзяржаўны занальны архіў г. Маладзечна.

***3.3***. У школьным музеі знойдзены ўспаміны старажылы в. Хажова Гана Іосіфа Васільевіча.

*Вывад*: У вёсцы Хажова з канца 15 стагоддзя дзейнічаў каталіцкі касцёл, які шмат разоў перабудовываўся, у апошні раз ў канцы 19 стагоддзя. Храм быў драўляны, на высокім каменным падмурку. Касцёл быў разбураны ў 1956 годзе.

***3.4***. У Дзяржаўным занальным архіве г. Маладзечна мы даведаліся, што ў яго фондах існуе гістарычны дакумент “Матэрыялы па гісторыі і геаграфіі Дісненскага і Віленскага ўездаў Віленскай губерніі” за 1896 год. У гэтым дакуменце ўпамінаецца пра Хажоўскі касцёл. Але ўсе вытрымкі былі зроблены на польскай мове. Работнікі архіва нам параілі звярнуцца да раённай газеты (“Маладзечанская газета”), так як у ёй быў змешчаны матэрыял пра касцёл.

*Вывад*: Намі выяўлена, што даступная інфармацыя аб Хажоўскім касцеле знаходзіцца ў мясцовай раённай газеце (“Маладзечанская газета”, №42, 28.05.2008г.). (Дадатак №4)

***3.5***. Разам з аднакласнікамі мы наведалі раённую бібліятэку. Мы ўважліва прагарталі падшыўку газеты за апошнія пяць гадоў і найшлі неабходны нам артыкул.

*Вывад*: намі выяўлена, што першы касцёл у Хажове быў заснаваны ў 1489 г канцлерам літоўскім Алёхнам Судзімонтавічам пад тытулам Святога Антонія Падуанскага. У сувязі з эпідэміямі і войнамі, якія прыводзілі касцёл у заняпад, храм адбудоўваўся і рэканструяваўся 5 разоў. Святыня знішчалася шведамі ў час Паўночнай вайны (1709-1710), французамі ў час Айчыннай вайны з Напалеонам (1812) і нарэшце мясцовымі ўладамі быў закрыты (1947), а потым увогуле разабраны (1956г.). Улічваючы, як праводзілася кіруючым рэжымам барацьба з рэлігіяй, магчыма, усё так і было. Касцёл быў разбураны ў гады савецкага атэізму.

***3.6***. Правёўшы апытанне вернікаў – католікаў нашай вёскі аб значэнні касцёла ў іх жыцці мы зрабілі наступны вывад.

*Вывад*: Прыхажане – католікі імкнуцца адрадзіць свой храм і цяпер. Вернікі вялікай вёскі Хажова вартыя таго, каб над ёй узвышаўся сучасны святы каталіцкі храм.

***3.7***. На аснове праведзеных мною даследаванняў я распрацаваў парады для вучняў нашай школы:

- даследуйце гісторыю сваёй роднай вёскі, гэта дапаможа вам лепш засвоіць гісторыю Айчыны;

- прыдумайце праект аднаўлення разбуранага касцёла, створанага нашымі продкамі;

- інфармуйце аднавяскоўцаў пра страчаны храм, каб пераканаць у неабходнасці знайсці сродкі для яго аднаўлення, каб гэтым спрыяць паляпшэнню жыцця людзей у роднай вёсцы;

- займайцеся краязнаўствам, яшчэ шмат “белых плям” у гісторыі нашага краю, вы маеце магчымасць стаць вядомымі;

- актыўна ўдзельнічайце ў вандроўках, экскурсіях, пашуковых мерапрыемствах, краязнаўчых конкурсах – гэта садзейнічае павышэнню пазнавальнай цікавасці да вывучэння роднага краю.

Вынікі:

- На месцы старога падмурка стаяў касцёл.
- Старажылы сяла, якія хадзілі на службу ў касцёл, успамінаюць яго з удзячнасцю.
- Прыхажане – каталікі імкнуцца адрадзіць свой храм і цяпер.

**Заключэнне**

У рамках работы я даказаў, што неабходна кожнаму чалавеку ведаць і шанаваць сваё мінулае. Знаёмячыся з мінулым сваёй вёскі я даведаўся аб існаванні на яе тэрыторыі гістарычна – краязнаўчага аб'екта – касцёла Святога Антонія Падуанскага. На сучасным этапе трэба глыбей задумацца аб захаванні існуючых помнікаў нашага краю. Сёння і заўсёды павінен кожны чалавек даражыць сваёй спадчынай, гэта часціца нашай любімай Радзімы.

У выніку даследавання падцверджана *гіпотэза*: на месцы старога падмурка ў нашай вёсцы ў мінулым стаяў каталіцкі храм. Ён меў вялікае значэнне ў жыцці каталіцкіх вернікаў і з'яўляўся гісторыка – краязнаўчым помнікам. Яго нельга было разбураць. Мы павінны шанаваць сваё мінулае.

Работа мае практычную накіраванасць і можа быць выкарыстана пры вывучэнні тэм па гісторыі Беларусі, грамадазнаўству, беларускай літаратуры і ў мерапрыемствах пазакласнай работы. Цікавай будзе работа бацькам і дзецям, якія зацікаўлены ў тым, каб адрадзіць і памятаць свае карані.

У будучым мы паспрабуем заняцца складаннем праекта аднаўлення разбуранага касцёла. Нам хочацца пры ўездзе ў вёску бачыць цудоўны храм, а не азірацца на руіны святыні – помнік нашаму бяспамяцтву.

**Выкарыстаныя крыніцы**

1. Абламскі, В.Я. Ахова і рэстаўрацыя помнікаў гісторыка – культурнай спадчыны // Беларуская культура сёння. – М., 2004

2. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. Зборнік артыкулаў. – Мн., 1992

3. Архіў Хажоўскага сельскага савета. Дакументы

4. Головко, О. Дорогой исследований / О. Головко // Учитель. – 2003. – №1. – с. 7-9

5. Деринский, А.В. Краеведение: пособие для учителя / А.В. Деринский. – М.: Просвещение, 1987. – 158с

6. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 года (са змян. і дап. прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996г і 17 кастрычніка 2004) / Мн., 2006

7. Каханоўскі, Г.А. Повязь часоў / Г.А. Каханоўскі. – Мн.: Полымя, 1985. – 112с

8. Мартос, А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни / А. Мартос. – М., 1990

9. Памяць: Маладзечанскі раён: Гісторыка – дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Мн: Бел. Эн., 2002

10.Пашков, Г.П. Республика Беларусь:Энцыклопедия в 6 томах. Том 1 / Г.П. Пашков и другие. – Мн.: Бел.Эн., 2005

12.Пашкоў, Г.П. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 тамах. Том 4 / Г.П. Пашкоў і іншыя. – Мн.:Бел. Эн., 1997. – 432 с.: іл.

13.Пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 13.02.2012 № 12-01-12/480дс

14.Світо, Ф. З гісторыі касцёла Святога Антонія Падуанскага ў вёсцы Хажова / Ф. Світо //Маладзечанская газета. – 2008. - №42. – с. 4

15.Свод памятников истории и культуры Белоруссии в 8 томах. Том 2 / Мн., 1984 - 1988

16. http: // news.tut.by/socie

**Дадатак**

***Успаміны Я.І. Сысун***

*Успаміны жыхаркі в. Хажова Я.І. Сысун*

Яніна Іванаўна Сысун – не толькі пражыла жыццё даўжынёй у 90 гадоў, але і вытрымала вайну, страціла сына. Яе жыццёвы шлях пачаўся ў вёсцы Хажова, у якой яна і сёння жыве.

Яніна Іванаўна вельмі памятае сваё дзяцінства. Яна з задавальненнем адказала на нашы пытанні. Яна расказала нам, што на месцы падмурка заўсёды стаяў касцёл. Быў ён драўляны, унутры ўпрыгожаны вялікімі фрэскамі. Побач, каля дарогі, стаяла драўляная, на тры ярусы з купалком наверсе, званіца. Колакал быў вельмі вялікі, звон ад яго разносіўся па ўсёй ваколіцы. Яніна Іванаўна ўспамінае, як яшчэ дзяўчынкай яна наведвала школу пры касцёле. А потым стала спяваць у хоры, які дзейнічаў у храме. У касцёле быў арган, таму тут заўсёды можна было пачуць гукі чароўнай арганнай музыкі.

Яніна Іванаўна ўспамінае, што ўсё жыццё прайшло ў працы. Вяскоўцы, напрацаваўшыся за тыдзень на палетках, з вялікай радасцю ў нядзелю ішлі на службу ў касцёл. Там яны забываліся аб усіх цяжкасцях і нягодах, маліліся, а потым вярталіся да хаты з добрым настроем, з новымі сіламі. Вера дапамагала ім выжыць у цяжкія гады ліхалецця, натхняла іх на працу.

На наша пытанне, ці хочацца ёй, каб аднавілі ў вёсцы касцёл, Яніна Іванаўна з усмешкай некалькі разоў паўтарыла: “Хочацца, вельмі хочацца, надта хочацца, каб святыня вярнулася на сваё месца!”

*Успаміны ўзяты ў 2013г Савіцкай Ж.А.*

***Успаміны старажылы вёскі Хажова І.В. Гана.***

Успаміны старажылы нашага сяла, 92-гадовага
Гана Іосіфа Васільевіча (1913-2007гг.)

Іосіф Васільевіч – ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ветэран працы, знакаміты жыхар нашай вёскі.

*– Касцёл стаяў у пачатку вёскі, каля дарогі, злева. У гэты касцёл хадзілі ўсе мае продкі, ён як бы існаваў заўсёды, кажуць з к. 15ст. Мой прадзед, дзед і бацька былі сялянамі. Прыгоннымі працавалі ў памесці мясцовага пана Хелхоўскага, якое знаходзілася недалёка ад касцёла, але сёння таксама ад яго засталіся толькі руіны ды скляпы. Дык вось, у цяжкія хвіліны свайго жыцця мае продкі хадзілі маліцца ў касцёл, гэта было для іх святое месца, бо, прыйшоўшы дадому, яны астаўлялі там душэўны неспакой і гора, ярмо цяжкай працы. У касцёле яны знаходзілі суцяшэнне і падтрымку. А назаўтра з новымі сіламі зараблялі сабе і дзецям хлеб.*

Хадзіў у касцёл і сам Іосіф Васільевіч. У далёкім 20-м – маліўся за бацьку, каб вярнуўся дадому з грамадзянскай вайны. У 30-х гадах прасіў уз'яднання з братамі, бо апынуўся ў Заходняй Беларусі, якая адышла да Польшчы. А ў 40-х гадах у касцёл хадзіла яго маці, якая ў малітвах прасіла каб яе сын, Іосіф, вярнуўся з фронту жывым. І ён вярнуўся… А прайшоў з Чырвонай Арміяй аж да Берліна. Пабачыў жахі Другой сусветнай.

Быў Іосіф Васільевіч паранены некалькі разоў, кантужаны; не раз глядзеў смерці ў вочы. Але выжыў. Вярнуўся ў родную вёску. Працаваў. Жаніўся. Вырасціў сына.

Але сёння ён не можа пайсці ў касцёл, як хадзілі яго продкі і ён калісьці. Бо ў 1947 годзе ён быў закрыты, а ў 1956 г быў поўнасцю разбураны, застаўся толькі падмурак.

Сёння, калі ўязджаем у нашу вёску, то злева, каля дарогі, на ўзгорку, стаіць крыж. Гэта памяць не толькі аб стаяўшым тут стагоддзямі касцёле, але і памяць аб жыцці нашых продкаў, аб іх бедах і перамогах.

Каталіцкія вернікі нашай вёскі мараць адбудаваць, адрадзіць касцёл. З ім яны звязваюць сваю гісторыю, мінулае сваёй вёскі, сваіх продкаў.

*Успаміны ўзяты ў 2005г. Савіцкай Ж.А.*

***Успаміны Грышэль Софіі Іванаўны, 1927 г.н., жыхаркі в. Мойсічы***

*– З аповядаў маіх бацькоў я ведаю, што гару пры ўездзе ў в. Хажова ў народзе называлі "Ксяндзова". Лужок, які знаходзіўся ў нізіне, за гарой, таксама называлі "Ксяндзоў". На гары знаходзіўся касцёл і званіца, а праз дарогу стаяў жылы дом ксяндзя (плябанія) і школа, якая дзейнічала пры касцёле. Таму адсюль і назва такая пайшла.*

*А ў 1911 годзе прыязджаў наш беларускі пісьменнік Якуб Колас у вёску Мойсічы па запрашэнні да сябра Мацея Рафаілавіча Цярэшкі на "Дзяды". Яны пазнаёміліся, калі разам знаходзіліся ў Мінскім астрозе. У астрог ездзіла адведваць Якуба Коласа, па просьбе маладзечанскіх настаўнікаў, рэвалюцыянерка Лізавета Андрэеўна Карніловіч. Сама яна была дачкой настаяцеля праваслаўнай царквы ў Хажове Андрэя Карніловіча. Працавала настаўніцай у Хажоўскай школе.*

З 1869 г па 1918 год Хажоўскі касцёл быў ператвораны ў праваслаўны храм. Сям'я айца Андрэя Карніловіча жыла ў ксяндзовым доме.

*- Дык вось, калі Якуб Колас быў у сябра ў гасцях у в. Мойсічы, то наведаўся ў госці ў "ксяндзову" хату да Лізаветы Андрэеўны і яе сям'і. Кажуць, што Якуб Колас нават прысвяціў свой верш настаўніцы, які назваў "Школьная работніца".*

Г.А. Каханоўскі таксама ўпамінаў пра гэты факт у апавяданні "Тут помняць Коласа" ў кнізе "Повязь часоў". [7; с.68]

*Успаміны ўзяты ў 2013г. Савіцкай Ж.А.*

**Дадатак №5**

***Колькасць прыхажан – каталікаў у Хажоўскай парафіі***

1781 г – 4911 вернікаў
1842 г – 880 вернікаў
1867 г – 1187 вернікаў
1932 г – 1055 вернікаў
1939 г – 1230 вернікаў
2013 г – 300 вернікаў (20%). [3]